ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
31.10.2022 № 644

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2023 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Праграма структуравана ў адпаведнасці з асноўнымі змястоўнымі лініямі моўнай адукацыі.

Мэта праграмы – дапамагчы выпускнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі паўтарыць, падагульніць, сістэматызаваць:

веды пра сістэму мовы і маўленне;

правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні;

нормы беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя).

Змест праграмы дазваляе выпускнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі не толькі паўтарыць, падагульніць і сістэматызаваць веды па розных раздзелах беларускай мовы, але і ўдасканаліць адпаведныя ўменні і навыкі.

Уступныя іспыты па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» праводзяцца ў форме цэнтралізаванага экзамену або цэнтралізаванага тэсціравання. Змест тэставых заданняў вызначаецца дзеючай праграмай уступных іспытаў, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

Пасля заканчэння ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі абітурыент павінен в е д а ц ь:

прыметы тэксту, спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту, функцыянальныя стылі маўлення, тыпы маўлення і іх кампазіцыйныя схемы;

нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя);

фанетычную сістэму і фанетычныя з’явы беларускай мовы; асаблівасці вымаўлення галосных, зычных гукаў і іх спалучэнняў;

адназначныя і мнагазначныя словы, сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы; прыметы фразеалагізмаў, іх значэнне і сінтаксічную ролю;

марфемную будову слова, словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы; віды асноў; асноўныя спосабы ўтварэння слоў;

паняцці марфалогіі, класіфікацыю часцін мовы; марфалагічныя прыметы розных часцін мовы;

сінтаксічныя адзінкі, іх тыпы.

Абітурыент павінен у м е ц ь:

рабіць сэнсавы і кампазіцыйны аналіз тэксту: вызначаць прыметы тэксту, фармуляваць яго тэму і асноўную думку, даваць загаловак; вызначаць спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце; вызначаць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага тыпу, стылю і жанру маўлення;

адрозніваць гукі і літары, устанаўліваць паміж імі адпаведнасць;

вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць значэнні мнагазначных слоў, размяжоўваць значэнні амонімаў; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы; адрозніваць лексічнае значэнне паронімаў; выяўляць фразеалагізмы ў сказах, тэкстах, тлумачыць іх значэнне, вызначаць сінтаксічную ролю, правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце;

вызначаць марфемную будову і спосаб утварэння слоў; правільна пісаць словы з арфаграмамі, абумоўленымі марфемнай будовай слова;

распазнаваць часціны мовы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсава-граматычных прымет і сінтаксічнай ролі;

знаходзіць і выпраўляць арфаграфічныя памылкі;

вызначаць віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях, сінтаксічную функцыю слоў (словазлучэнняў) у сказе;

выяўляць у сказах сінтаксічныя канструкцыі, якія патрабуюць выдзялення знакамі прыпынку; знаходзіць і выпраўляць пунктуацыйныя памылкі;

успрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці, афармляць у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Маўленне. Тэкст. Стылістыка

Паняцці «мова» і «маўленне». Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне,

слуханне, чытанне, пісьмо.

Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць. Загаловак. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце.

Тыпы маўлення (апісанне, апавяданне, разважанне), іх кампазіцыйныя схемы.

Функцыянальныя стылі маўлення (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы), стылеўтваральныя моўныя сродкі.

Стылістычныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія

Фанетыка і арфаэпія. Гукі беларускай мовы. Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення (вымаўленне галосных, зычных і спалучэнняў зычных).

Суадноснасць гукаў і літар. Прызначэнне і гукавое значэнне літар е, ё, ю, я, і.

Склад і націск. Роля націску пры адрозненні слоў і некаторых формаў слоў. Акцэнталагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Арфаграфія. Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я.

Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах.

Прыстаўныя галосныя, іх правапіс.

Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія, санорныя; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс.

Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных.

Зычныя [д]–[$\widehat{дз}$’], [т]–[ц’], іх вымаўленне і правапіс.

Прыстаўныя і ўстаўныя зычныя, іх правапіс.

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс. Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.

Правапіс вялікай і малой літар.

Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна.

## Лексіка. Фразеалогія

Слова, яго лексічнае значэнне.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова.

Амонімы, іх адрозненне ад мнагазначных слоў.

Сінонімы, антонімы, іх роля ў маўленні.

Паронімы.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні.

Лексічныя, фразеалагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія

Марфемы як структурна значымыя часткі слова.

Аснова слова. Канчатак, нулявы канчатак.

Корань. Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова.

Чаргаванне галосных і зычных у аснове слова.

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны.

Правапіс і, ы, й пасля прыставак.

Словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы.

Асноўныя спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны, бяссуфіксны (нульсуфіксальны), постфіксальны, асноваскладанне, словаскладанне, абрэвіяцыя.

Складаныя словы, іх утварэнне і правапіс.

Складанаскарочаныя словы, іх утварэнне і правапіс.

Словаўтваральныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Марфалогія і арфаграфія

Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў.

Самастойныя і службовыя часціны мовы. Пераход слоў адных часцін мовы ў іншыя.

Назоўнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назоўнікаў.

Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя.

Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя, зборныя, рэчыўныя, іх лексічныя і граматычныя прыметы.

Род назоўнікаў. Назоўнікі мужчынскага роду, якія ўжываюцца для абазначэння асоб мужчынскага і жаночага полу. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Склон назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў па склонах.

Асновы назоўнікаў. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў. Назоўнікі 3-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў.

Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў у множным ліку. Скланенне ўласных назоўнікаў. Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі. Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі -ак-, -ык-, -ік-, -ачк-, -ечк-; мяккі знак перад суфіксамі -к-, -чык- і ў суфіксах -аньк-, -еньк-. Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс. Правапіс не (ня-), ні з назоўнікамі.

Прыметнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне. Утварэнне, ужыванне і правапіс прыналежных прыметнікаў. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Спосабы ўтварэння прыметнікаў. Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання і правапіс.

Правапіс прыметнікаў з суфіксам -ск-. Правапіс -н-, -нн- у прыметніках. Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў. Правапіс не (ня-) з прыметнікамі.

Лічэбнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Род і лік некаторых лічэбнікаў. Скланенне, ужыванне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў.

Спалучальнасць зборных лічэбнікаў у беларускай мове.

Займеннік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Скланенне і правапіс займеннікаў.

Утварэнне і ўжыванне займеннікаў.

Дзеяслоў як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе сінтаксічная роля.

Трыванні дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трыванняў.

Лады дзеяслова. Дзеясловы абвеснага, умоўнага і загаднага ладу, іх значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс.

Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых формаў дзеяслова.

Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Спосабы ўтварэння дзеясловаў.

Правапіс дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-, -оўва- (-ёўва-). Правапіс не (ня-) з дзеясловамі.

Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку ў сказах з

дзеепрыметнікавымі зваротамі.

Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне.

Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т-. Правапіс не (ня-) з дзеепрыметнікамі.

Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

Дзеепрыслоўі незаконачанага і законачанага трывання, іх утварэнне і правапіс.

Ужыванне дзеепрыслоўяў.

Правапіс не (ня-) з дзеепрыслоўямі.

Прыслоўе як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Ступені параўнання якасных прыслоўяў, іх утварэнне і ўжыванне.

Утварэнне прыслоўяў.

Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў. Правапіс не (ня-), ні з прыслоўямі.

Прыназоўнік як службовая часціна мовы.

Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх правапіс.

Ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Злучнік як службовая часціна мовы.

Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне.

Адзіночныя, парныя, паўторныя злучнікі, іх ужыванне і правапіс.

Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне.

Часціца як службовая часціна мовы.

Правапіс часціц. Часціцы не і ні, іх ужыванне і правапіс.

Выклічнік як асобая часціна мовы.

Правапіс выклічнікаў.

Знакі прыпынку ў сказах з выклічнікамі.

Марфалагічныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Сінтаксіс і пунктуацыя

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.

Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні.

Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні. Класіфікацыя

словазлучэнняў па галоўным слове. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай).

Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка.

Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі. Знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Просты сказ. Парадак слоў у сказе. Развітыя і неразвітыя сказы.

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння. Просты дзеяслоўны выказнік. Састаўны дзеяслоўны і састаўны іменны выказнікі. Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным спалучэннем. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння.

Аднасастаўныя сказы, іх будова. Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе.

Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх).

Сказы са звароткамі. Спосабы выражэння звароткa. Неразвітыя і развітыя звароткі. Знакі прыпынку ў сказах са звароткамі.

Сказы з пабочнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.

Сказы з устаўнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з устаўнымі канструкцыямі.

Сказы з адасобленымі членамі.

Сказы з адасобленымі азначэннямі (дапасаванымі, недапасаванымі) і прыдаткамі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі азначэннямі і прыдаткамі.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі дапаўненнямі.

Сказы з адасобленымі акалічнасцямі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі акалічнасцямі.

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі.

Складаны сказ. Сінтаксічныя прыметы складанага сказа. Сродкі сувязі частак складанага сказа. Тыпы складаных сказаў.

Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

Складаназалежныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы як сродкі сувязі частак

складаназалежнага сказа. Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснай часткай месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнай, параўнальнай, спосабу дзеяння, меры і ступені. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

Простая і ўскосная мова як спосабы перадачы чужой мовы. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Правілы замены простай мовы на ўскосную.

Дыялог, яго афармленне на пісьме.

Цытаты, іх афармленне на пісьме.

Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

2. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

3. Валочка, Г.М. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, С.А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

4. Бадзевіч, З.І. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

5. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2019 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

6. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).

7. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021 (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ru/ucheniky/podgotovka-k-ekzamenam.html).